УДК 94(476)

***П.А. Жылінскі***
*магістр гіст. навук, аспірант каф. гісторыі Беларусі новага і навейшага часу*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
e-mail: zhilinski@tut.by

# РАЗВІЦЦЁ ПРЫВАТНАГА СЕКТАРА ЭКАНОМІКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ у 1991–1994 гг.

*Артыкул ахоплівае адзін з маладаследаваных бакоў гісторыі сувярэннай Рэспублікі Беларусь. На аснове шырокай групы крыніц асвятляецца праблема развіцця прыватнага сектара эканомікі Беларусі ў першай палове 1990-х гг. Аўтар вылучае асаблівасці ажыццяўлення прыватызацыі, а таксама працэсы развіцця беларускага прадпрымальніцтва, яго асноўныя характэрныя рысы, асвятляе асноўныя накірункі палітыкі па прыцягненні замежных інвестыцый. У артыкуле таксама адлюстраваны асноўныя напрамкі развіцця прыватнага сектара на вёсцы на пачатковай стадыі пераходу да рынкавых адносін.*

## Уводзіны

Станаўленне і развіццё рынкавай эканомікі ў Беларусі першых гадоў незалежнасці з'яўляецца адной з тых тэм, якія амаль не закранала сучасная беларуская гістарыяграфія. Між тым праблематыка навейшай гісторыі Беларусі застаецца вельмі актуальнай, асабліва ва ўмовах працягу працэсаў трансфармацыі гаспадаркі і тых паступовых змен, якія назіраюцца ў сацыяльна-эканамічнай сферы на сучасным этапе развіцця.

Асаблівай увагі патрабуе вывучэнне станаўлення прыватнага сектара – найбольш важнай часткі нацыянальнай эканомікі. Без наяўнасці развітых прыватнаўласніцкіх адносін немагчыма функцыянаванне паўнавартаснага рынку, пра пераход да якога ў 1990 г. дэкларавалі беларускія ўлады. Менавіта развіццё прыватнага сектара, працэсы прыватызацыі, прыцягненне замежных інвестыцый сталі аднымі з ключавых мерапрыемстваў па пераходу беларускай гаспадаркі да рынкавых адносін.

## Працэсы прыватызацыі

Да 1993 г. працэсы прыватызацыі і раздзяржаўлення здзяйсняліся ў рэспубліцы на аснове Дзяржаўнай праграмы па пераходу да рынку, законаў «Аб уласнасці», «Аб прадпрыемствах», «Аб арэндзе» і шэрагу спецыяльных пастаноў, напрыклад, «Часовага палажэння пра парадак прыватызацыі». Праз недасканалую прававую аснову працэс прыватызацыі рухаўся дастаткова марудна, нягледзячы на тое, што народ чакаў раздзяржаўлення (43% апытаных беларусаў у 1992 г. выступалі за хуткі пачатак гэтых працэсаў [1, арк. 23] ).

«Праграмай раздзяржаўлення эканомікі і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці на 1992 г.» вызначалася, што прыярытэтнай формай прыватызацыі для невялікіх прадпрыемстваў з'яўляецца арэнда з выкупам, а таксама стварэнне калектыўных (народных) прадпрыемстваў; буйныя арганізацыі было рэкамендавана прыватызаваць шляхам стварэння акцыянерных таварыстваў. У выніку на першапачатковым этапе прыватызацыя ажыццяўлялася пераважна праз выкуп прадпрыемстваў арэндатарамі і працоўнымі калектывамі. Ужо ў 1992 г. было прыватызавана 157 камунальных устаноў і 32 прадпрыемствы рэспубліканскай уласнасці [2, с. 4], у тым ліку завод «Дормаш», вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне «Пінскдрэў», швейнае прадпрыемства «Мілавіца» [3, арк. 41–42].

---

Навуковы кіраўнік – М.П. Касцюк, доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі

У праграме дзейнасці ўрада на наступны 1993 г. былі закладзены такія ж асцярожныя тэмпы раздзяржаўлення. З мэтай узмацнення кантролю Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у 1992 г. сваёй пастановай № 715 устанавіў парадак адчужэння дзяржаўнай маёмасці, а для кіравання гэтымі працэсамі быў утвораны спецыяльны дзяржаўны камітэт, які ў 1994 г. атрымаў статус міністэрства.

Яшчэ ў 1991 г. была здзейснена першая спроба прыняць закон аб прыватызацыі, але тады яна праваліласся. Дэпутат Л. Козік адзначаў: «Згуляў псіхалагічны момант. Адныя дэпутаты слаба вывучылі праект, і, магчыма, ім не ўсё было зразумела, іншыя, відавочна, убачылі ў праекце закона магчымасць ліквідацыі шэрагу структур, у якіх яны самі сёння занятыя, трэція ўвогуле ніколі не ўспрымуць гэтых працэсаў» [4, с. 5]. Адпаведны прававы акт Вярхоўны Савет зацвердзіў толькі ў студзені 1993 г. На думку распрацоўшчыкаў, праект закона аб прыватызацыі быў «накіраваны на стварэнне ўмоў для развіцця эфектыўнай і сацыяльна-арыентаванай рынкавай эканомікі» [5, арк. 74]. «Найбольш яскрава адрозненне нашага законапраекта» ў тым, што мы «прапануем не абмяжоўваць працэс рэфармавання дзяржаўнай уласнасці вузкімі рамкамі, – паведамляў прадстаўнік камітэта дзяржмаёмасці В. Мацюшэўскі. – Праектам прадугледжваецца …арэнда з выкупам, продаж аб'ектаў па конкурсе, бясплатная перадача маёмасці …шырокі спектр спосабаў прыватызацыі падкрэслівае больш дэмакратычны характар нашага закона ў параўнанні з суседнімі нам дзяржавамі» [5, арк. 68]. У адпаведнасці з прынятай у мэтах рэалізацыі закона праграмай прыватызацыі ў наступныя пяць год у прыватныя рукі павінна было перайсці дзве трэці дзяржаўнай уласнасці.

Ва ўмовах, калі большасць месцаў у тагачасным Вярхоўным Савеце належала прадстаўнікам камуністычнай партыі, а таксама па прычыне таго, што не заўсёды ўдалым быў вопыт у гэтых працэсах ў суседняй Расіі, праект закона атрымаўся дастаткова асцярожным. Нават апазіцыя выступала супраць хуткай і ўсеагульнай прыватызацыі. Так, дэпутат ад фракцыі БНФ М. Крыжаноўскі адзначаў: «Мы не павінны праводзіць хуткую, абвальную прыватызацыю. Мы павінны спачатку мацаваць дзяржаўны сектар эканомікі» [6, арк. 33].

Асаблівасцю беларускага закона аб прыватызацыі было тое, што толькі палова прыватызацыйных фондаў прадавалася за грошы, па астатняй палове прадугледжвалася бязвыплатная перадача насельніцтву. Аднак гэты механізм не быў дэталёва распрацаваны. Норма аб тым, што 50% аб'ектаў прыватызацыі павінна была аплочвацца спецыяльнымі чэкамі, абарот якіх рэгуляваўся Законам ад 06.07.1993, адштурхоўвала замежных інвестараў, у тым ліку з-за няяснасці аплаты. Нягледзячы на тое, што эксперты, якія працавалі над законапраектам, лічылі дадзеную меру неэфектыўнай і нават шкоднай, перавагу ў прыватызацыйных працэсах аддалі працоўным калектывам. Камітэт дзяржмаёмасці адзначаў, што гэтая ідэя была праведзена «пасля настойлівых патрабаванняў прафсаюзаў і працоўных», а ўрад зыходзіў «з таго, што прыватызацыя – катэгорыя не толькі эканамічная, але і палітычная» [5, арк. 68].

Асцерагаючыся спекуляцый з выдадзенымі насельніцтву пасведчаннямі на бязвыплатна перадаваемую долю маёмасці, законатворцы зрабілі прыватызацыйныя чэкі імяннымі і ўскладнілі працэдуру іх уліку і абарачэння. Беларускія чэкі былі двух відаў: «Жыллё», якія прызначаліся для прыватызацыі жылля, і «Маёмасць» – для ўдзелу ў прыватызацыі прадпрыемстваў. Намінальная цана чэкаў і балансавы кошт прыватызуемай маёмасці былі ўраўнаважаны. Пры гэтым прадугледжвалася, што чэкі будуць абменьвацца на акцыі па наміналу. Выдача грамадзянам прыватызацыйных чэкаў пачалася толькі з 1 красавіка 1994 г. [7, арк. 217].

З мэтай дапамагчы людзям арыентавацца на рынку каштоўных папер былі створаны спецыялізаваныя інвестыцыйныя фонды (СІФы), якія працавалі на аснове простай схемы: набывалі ў грамадзян прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць» у абмен на ўласныя акцыі, а затым у абмен на гэтыя чэкі куплялі акцыі прадпрыемстваў. З 1994 г. лі-

цэнзіі на дзейнасць ў якасці СІФаў атрымалі 47 арганізацый, у самую буйную з якіх – Першы рэспубліканскі інвестыцыйны фонд – уклалі свае чэкі больш за 60 тыс. жыхароў Беларусі [8, с. 9]. Але хутка сталі відавочнымі шматлікія супярэчнасці. Інвестыцыйныя фонды не маглі набываць больш за 10% акцый прадпрыемства падчас яго прыватызацыі і ўкладаць больш за 5% сваёй маёмасці ў каштоўныя паперы аднаго эмітэнта [8, с. 9]. У выніку СІФы практычна адмовіліся ад кіравання пакетамі акцый і перайшлі да скупкі ў насельніцтва акцый і чэкаў па заніжаных коштах пад замову, што дрэнна адбівалася на іх рэпутацыі і прыводзіла да несправядлівых перакосаў пры размеркаванні дзяржаўнай уласнасці.

Трэба адзначыць, што працэс чэкавай прыватызацыі рухаўся вельмі марудна. Доўгі час не было палажэння аб арганізацыі чэкавых аўкцыёнаў. Да лістапада 1994 г. толькі 5% грамадзян атрымалі свае чэкі і толькі 12% з тых, хто іх атрымаў, куды-небудзь іх уклалі [9, с. 10]. Прыватызацыя іншымі спосабамі таксама адбывалася вельмі павольна, ішла толькі на тых прадпрыемствах, дзе была прадугледжана да прыняцця адпаведнага закона (да канца 1993 г. было прыватызавана 10% асноўных фондаў, якія планаваліся да перадачы ў прыватныя рукі) [10, арк. 11]. Як казалі некаторыя дэпутаты, «існуючыя сёння законы практычна цалкам спынілі гэтыя працэсы» [11, арк. 185]. Нават прыватызацыя жылля, якая не выклікала бурных ідэалагічных дыскусій, замарудзілася: да 1995 г. было прыватызавана толькі каля ⅓ жыллёвага фонду краіны [12, с. 36].

Працэс прыватызацыі натыкаўся на шэраг праблем. Нярэдка не ўлічвалася меркаванне працоўных калектываў. Пэўны час ацэнка выкупаемай маёмасці праводзілася не па рынкавай цане, а па рэштквавым кошце бухгалтарскага балансу, што заніжала кошты фондаў прадпрыемстваў у некалькі разоў. Таксама перашкода бачылася ў празмерным развіцці адносін арэнды, якая з'яўлялася самым распаўсюджаным шляхам раздзяржаўлення. Склалася сітуацыя, калі прыватызацыя праз арэнду амаль спынілася, бо далёка не ўсе арэндаваныя прадпрыемствы імкнуліся да выкупу маёмасці, а раздзяржаўленне такога прадпрыемства без згоды працоўнага калектыву было немагчымым.

Нявыгадна было займацца прыватызацыяй камунальных аб'ектаў. Паводле закона «Аб дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь» на 1993 г., было ўстаноўлена, што толькі 30% сродкаў ад прыватызацыі аб'ектаў дзяржаўнай (у тым ліку камунальнай) уласнасці накіроўваліся ў прыбытак мясцовага бюджэту. Такая практыка выклікала незадаволенасць рэгіянальных уладаў. Гарсавет Наваполацка, напрыклад, прасіў урад пакінуць усе сродкі ад прыватызацыі камунальных прадпрыемстваў у бюджэце горада [9, арк. 24–25].

Бывала, што мясцовыя праграмы прыватызацыі не зацвярджаліся па ідэалагічных прычынах. Нягледзячы на сацыяльную скіраванасць беларускай прыватызацыі, ва ўмовах гіперінфляцыі станавілася зразумела, што толькі абмежаванае кола людзей выйграе ў выніку пераходу дзяржаўнай уласнасці ў прыватныя рукі. Дэпутаты адзначалі, што «сённяшняя інфляцыя …адсутнасць грошай у прадпрыемстваў і тых людзей, хто вырашыў набыць нешта ва ўласнасць, практычна не дае рэалізаваць гэтую праграму» [11, арк. 185]. Нягледзячы на складанасці, да канца 1994 г. у Беларусі было прыватызавана 1 129 прадпрыемстваў, з іх шляхам пераўтварэння ў гаспадарчыя (акцыянерныя) таварыствы дзяржаўных прадпрыемстваў – 281, арэндных прадпрыемстваў – 45, выкупу арандаванай маёмасці арэнднымі прадпрыемствамі – 492, прададзена на аўкцыёне (па конкурсе) – 311 [13, с. 121]. Прычым на працягу першых гадоў незалежнасці назіралася станоўчая дынаміка росту аб'ёмаў прыватызацыі.

У 1993–1994 гг. павялічылася роля продажу ўласнасці праз конкурсныя працэдуры. Буйная арганізацыі пераўтвараліся ў асноўным праз акцыянаванне. Большасць прыватызаваных у краіне прадпрыемстваў адносіліся да сектара паслуг, гандлю і лёгкай прамысловасці. У асноўным гэта была малая прыватызацыя, якая не закранула беларускія прамысловыя гіганты.

**Развіццё прадпрымальніцтва**

У першыя гады незалежнасці працягваў развівацца і пашырацца прыватнаўласніцкі сектар. Ужо на 1 ліпеня 1993 г. у рэспубліцы мелася 168 тыс. прыватных суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку 67,5 тыс. юрыдычных асоб і 100,5 тыс. індывідуальных прадпрымальнікаў [14, арк. 231]. Меншая і больш актыўная частка насельніцтва была гатова ісці ў прыватны бізнес, нягледзячы на няўпэўненасць. У 1992 г. 39,4% апытаных беларусаў жадалі быць прадпрымальнікамі і 41,2% гатовы былі рызыкаваць, каб больш зарабляць [1, арк. 38, 40].

Першапачаткова галоўнай мэтай развіцця прадпрымальніцтва было імкненне забяспечыць напаўненне спажывецкага рынку. Бізнес паспяхова выконваў гэтую задачу. Айчынны рынак насычаўся, у першую чаргу, за кошт імпарту. Вуліцы беларускіх гарадоў пакрыла сетка кіёскаў, лавак, малых крам. Некаторыя беларусы гандлявалі проста на вуліцы. Вакол буйных спартыўных аб'ектаў выраслі рэчавыя рынкі з намётамі прадпрымальнікаў, у якіх лёгка, ў першую чаргу за валюту, можна было набыць імпартныя рэчы з лэйбламі замежных брэндаў, прывезеныя з Турцыі, Польшчы, Расіі і Кітая. У вялікіх крамах, у прадуктовых магазінах таксама існавалі валютныя секцыі, дзе без праблем можна было купіць дэфіцытныя далікатэсы.

Але бізнес па-ранейшаму не ішоў у вытворчасць. Прыватная прадпрыемствы ў структуры прамысловасці рэспублікі на канец 1993 г. складалі толькі 4%, арэндныя – 14% [14, арк. 232]. Фінансавая база прадпрымальніцтва была моцна падарваная структурнымі зменамі. Высокія тэмпы інфляцыі прывялі да абясцэньвання раней заробленых грошай, зніжэння плацёжаздольнасці, назіралася недаступнасць банкаўскіх крэдытаў (доўгатэрміновыя крэдыты банкамі амаль не выдзяляліся). Тармазілі развіццё прадпрымальніцтва высокія падатковыя тарыфы, якія, па дадзеных Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, у сярэднім былі на 20–30% вышэй, чым у суседніх краінах, а прыватныя арганізацыі вымушаны былі плаціць 28 відаў розных падаткаў [14, арк. 235]. Душылі камерцыйную дзейнасць таксама рост арэнднай платы і рознага кшталту абмежаванні ў выглядзе ліцэнзій і квот. Вынікам гэтага стала спусташэнне значнай часткі прыватных структур, а таксама пераарыентацыя на пераважна невытворчыя віды дзейнасці. Як паведамлялі прадстаўнікі мясцовых уладаў, менавіта праз бязглуздыя патрабаванні розных справаздач і драпежніцкіх падаткаў і так «малалікая колькасць кааператываў і малых прадпрыемстваў, якія рабілі спробы вытворчай дзейнасці, скончылі сваё існаванне» [15, арк. 30].

Галоўнымі прэтэнзіямі прадпрымальнікаў да дзяржавы ў першай палове 1990-х гг. былі непаслядоўнасць падатковай палітыкі, ціск з боку бюракратычнага апарату, адсутнасць добрай прававой асновы, уплыў цэнтралізавана-планавай эканомікі, разрыў гаспадарчых сувязяў [14, арк. 236]. У такіх умовах урад быў вымушаны ў першай палове 1994 г. прыняць шэраг пастаноў (№ 327 ад 12.05.1994; № 395 ад 27.05.1994; № 427 ад 10.06.1994), накіраваных на паляпшэнне бізнес-клімату.

Ва ўмовах высокай інфляцыі прыватны сектар засяродзіўся ў асноўным на такіх высокапрыбытковых галінах, як гандлёва-закупачная і пасрэдніцкая дзейнасць. У адпаведнасці з экспертным аналізам у гэтых сферах было занята да 60% работнікаў прадпрымальніцкай сферы [14, арк. 232]. У 1994 г. у гандлі і грамадскім харчаванні працавала амаль палова з больш чым 13 тыс. недзяржаўных прадпрыемстваў [13, с. 80–81]. Развіццю гандлёвай і пасярэдніцкай дзейнасці садзейнічала захаванне дзяржаўнага кантролю за цэнамі, дыспарытэт цэнаў на замежных і ўнутраным рынках, адставанне памераў ставак банкаўскіх крэдытаў ад узроўню інфляцыі.

Станаўленне недзяржаўнага сектару ў Беларусі адбывалася найперш не шляхам прыватызацыі значных прадпрыемстваў, а праз спецыфічнае дзяржаўна-прыватнае партнёрства, калі вакол буйных дзяржаўных прадпрыемстваў фармаваўся шэраг невялікіх

прыватных пасрэдніцкіх або гандлёвых структур. Напрыклад, па інфармацыі прэсы, на заводзе МАЗ у 1992 г. дзейнічала каля 40 такіх прыватных арганізацый [16, с. 14].

У 1994 г., па дадзеных ЕБРР, доля прыватнага сектара ў агульным аб'ёме ВУП дасягнула 15%, але гэта было значна менш, чым у суседніх краінах СНД і Прыбалтыкі (малюнак), дзе адбываліся працэсы поўнамаштабнага раздзяржаўлення [17, с. 196]. Па тагачасных прагнозах Інстытута эканомікі НАН Беларусі, чакаць дасягнення сярэднесусветных паказчыкаў па ўзроўні развіцця прадпрымальніцтва хутка не прыходзілася, паколькі пры тэмпах, якія існавалі, паўнавартасны прадпрымальніцкі асяродак магчыма было сфармаваць не раней чым праз тры–чатыры пяцігодкі [14, арк. 232].



| | 1990 | 1991 | 1992 | 1993 | 1994 |
|---|---|---|---|---|---|
| Беларусь | 5 | 5 | 10 | 10 | 15 |
| Расія | 5 | 5 | 25 | 40 | 50 |
| Украіна | 10 | 10 | 10 | 15 | 40 |
| Літва | 10 | 10 | 20 | 35 | 60 |
| Латвія | 10 | 10 | 25 | 30 | 40 |
| Эстонія | 10 | 10 | 25 | 40 | 55 |

**Малюнак. – Змены долі прыватнага сектара ў аб'ёме ВУП, %**

*Крыніца: уласная распрацоўка на аснове [1].*

**Прыцягненне замежных інвестыцый**

Падчас абмеркавання праграмы пераходу Беларусі да рынкавай эканомікі старшыня парламенцкай камісіі па эканамічнай рэформе Л. Козік адзначаў: «Трэба даць магчымасць любому замежнаму бізнесмену арганізаваць сваё прадпрыемства ў БССР. Няхай пакажуць, як трэба працаваць, гэта дазволіць лягчэй выходзіць на сусветны рынак» [18, арк. 148]. Менавіта ва ўмовах недахопу ўласных фінансавых рэсурсаў у першыя гады незалежнасці станавілася актуальнай палітыка па прыцягненні прамых замежных інвестыцый, сумарны аб'ём якіх з 1991 па 1993 г. ацэньваўся ў 256 млн дол. ЗША [19, с. 58]. Ключавую ролю ў працэсе прыцягнення інвестараў павінен быў адыграць Закон «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». У першую чаргу інвестыцыі прыходзілі ў беларускую эканоміку праз утварэнне прадпрыемстваў з удзелам замежнага капіталу.

На 1 лістапада 1994 г. у рэспубліцы было зарэгістравана 1 518 сумесных і 543 замежныя прадпрыемствы. Аб'яўлены ўнёсак ва ўстаўны фонд сумесных прадпрыемстваў склаў 655 млн дол. ЗША, у тым ліку доля інвестараў – 290 млн дол.; ва ўстаўны фонд замежных прадпрыемстваў – 23 млн дол. ЗША. Геаграфія паходжання інвестыцый была дастаткова шырокай: больш чым 70 краін свету. Найбольшая колькасць новых прадпрыемстваў узнікла пры удзеле інвестараў з Польшчы, Германіі, ЗША, Італіі, Аўстрыі [20, арк. 180]. Але тэмпы інфляцыі абмяжоўвалі інвестыцыйную дзейнасць. Рэальна атрымоўваць і вяртаць крэдыты пад 300% гадавых было магчыма толькі пад правядзенне высокапрыбытковых аперацый. Таксама праблемамі былі неспрыяльная падатковая палітыка і адсутнасць зацікаўленасці дзяржавы. З усіх зарэгістраваных у 1993 г.

сумесных прадпрыемстваў да дзейнасці прыступілі толькі 16%, рэальныя ўкладанні ва ўстаўныя фонды не перавышалі 20–30% ад заяўленых сум [14, арк. 232–233]. Часткова гэта было абумоўлена тым, што шэраг замежных партнераў выйшлі з сумесных праектаў па прычыне поўнай бесперспектыўнасці работы ў Беларусі.

Трэба адзначыць, што замежны бізнес цікавілі ў першую чаргу буйныя прадпрыемствы перапрацоўчай галіны прамысловасці. Улічваючы разрыў гаспадарчых сувязяў і тое, што беларускія прадпрыемствы былі, як правіла, завяршальным звяном ланцугоў вытворчага цыкла, гучалі меркаванні аб неабходнасці стварэння канцэрнаў з удзелам прадпрыемстваў Расіі і іншых рэспублік СНД, цесна звязаных з беларускім прамысловым комплексам. У першай палове 1990-х гг. урад вёў перамовы аб магчымасці продажу часткі акцый прадпрыемстваў паліўна-энергетычнага сектара расійскім інвестарам. У Камітэт дзяржмаёмасці быў прадстаўлены шэраг прапаноў аб стварэнні міждзяржаўных акцыянерных кампаній на базе Мазырскага і Наваполацкага нафтаперапрацоўчых заводаў, ПА «Белтрансгаз», ПА «Азот». Дзеля маждівай прыватызацыі ў 1994 г. было запланавана правесці акцыянаванне гэтых арганізацый [9, арк. 10–12]. Але сур'ёзных прапаноў адносна набыцця іншых буйных заводаў, пераважна заснаваных на імпартуемай сыравіне, не было.

**Развіццё прыватнаўласніцкіх адносін на вёсцы**

Насельніцтва Беларусі ў большасці падтрымлівала перадачу зямлі ва ўласнасць сялян (у 1992 г. падчас апытанняў па замове ўрада 78,8% рэспандэнтаў ухвалілі гэтую ідэю) [1, арк. 41]. У той жа час станавіцца прадпрымальнікамі на вёсцы імкнуліся далёка не ўсе. Беларуская служба «Грамадская думка» правяла сацыялагічнае даследаванне, згодна з якім толькі 7,5% сялян жадалі стаць фермерамі. Большая ж частка вяскоўцаў проста хацела пашырыць свае прысядзібныя надзелы [21, с. 2]. У гэтых умовах дзяржава не спяшалася разбураць такія буйныя таварныя гаспадаркі, як калгасы і саўгасы. Намеснік старшыні Савета Міністраў Ф. Сянько, яшчэ ў 1990 г. адзначаў, што «сялянскія гаспадаркі будуць арганізоўвацца не замест калгасаў і саўгасаў, не ў процівагу ім, а поруч з імі ў якасці роўных партнёраў» [22, арк. 112].

У станаўленні новай эканамічнай мадэлі на вёсцы важнай кропкай стала прыняцце ў ліпені 1993 г. Закона «Аб праве прыватнай уласнасці на зямлю», які ўсталяваў формы зямельнай уласнасці, асновы іх узнікнення, зменаў і прыпынення. Згодна з нарматыўным актам прыватная ўласнасць прадстаўлялася толькі грамадзянам, якія атрымалі зямлю для вядзення прыватнай прысядзібнай гаспадаркі (да 1 га), для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, для садаводства і дачнага будаўніцтва. Шырокай прыватызацыі новым законам не прадугледжвалася. Распрацоўшчыкі зыходзілі з таго, што чапаць землі сельскагаспадарчага прызначэння пакуль нельга, бо немэтазгодна ламаць існуючыя структуры працы [23, с. 5]. У выніку рэалізацыі Закона да пачатку 1995 г. у прыватную ўласнасць было перададзена 34,3 тыс. га зямлі, з іх для вядзення прысядзібнай гаспадаркі 26,2 тыс. га, для будаўніцтва і абслугоўвання прыватных дамоў 3,56 тыс. га, садаводства і будаўніцтва лецішчаў 4,5 тыс. га. Для пашырэння прыватных прысядзібных гаспадарак вылучана 17 тыс. га [24, с. 128].

Апазіцыйныя БНФ і Сялянская партыя падтрымоўвалі пашырэнне прыватнаўласніцкіх адносін і выступалі за больш масавую прыватызацыю зямельнага фонду, прапанаваўшы альтэрнатыўны законапраект. Па словах аднаго з яго аўтараў Л. Зданевіча, «прыватызацыя (зямлі – *П.Ж.*) не толькі магчыма, але і неабходна, бо з'яўляецца адной з найважнейшых умоў усталявання рынкавых адносін у эканоміцы, гарантам свабоднай прадпрымальніцкай дзейнасці, павышэння эфектыўнасці сельгасвытворчасці і якасці землекарыстання» [25, арк. 112]. Альтэрнатыўны законапраект прадугледжваў, што толькі 30–40% сельскагаспадарчых зямель трэба бясплатна перадаць у прыватныя рукі праз механізм імянных прыватызацыйных чэкаў. Астатнія землі паступова павінны

былі выкупляцца праз доўгатэрміновую арэнду і іншыя формы землекарыстання. У апазіцыйным праекце прадугледжвалася захаванне калгасаў у форме гаспадарак з калектыўна-долевай уласнасцю. Такім чынам, нават апазіцыянеры асцярожна падыходзілі да прыватызацыйных мерапрыемстваў на вёсцы, падтрымліваючы паступовы, эвалюцыйны шлях фарміравання тут прыватнаўласніцкага сектара.

Ва ўмовах, калі кіраўніцтва адмовілася ад масавай прыватызацыі сельскагаспадарчых зямель, найбольш выразнай формай станаўлення прыватнаўласніцкіх адносін у сельскай гаспадарцы заставалася фермерства. Ужо ў пачатку 1994 г. колькасць фермерскіх гаспадарак дасягнула 2 730, якія апрацоўвалі 55,7 тыс. га зямлі, але іх удзельная вага ў вытворчасці таварнай прадукцыі была нязначнай (табліца) [13, с. 279].

Табліца. – Развіццё фермерства ў 1991–1995 гг.

| 1991 г. | 1992 г. | 1993 г. | 1994 г. | 1995 г. |
|---|---|---|---|---|
| Колькасць фермерскіх гаспадарак на пачатак года | | | | |
| 84 | 757 | 2 372 | 2 730 | 2 954 |
| Зямельныя плошчы, замацаваныя за імі, га | | | | |
| 1 937 | 15 564 | 45 551 | 55 753 | 60 744 |

*Крыніца: уласная распрацоўка на аснове [13, с. 279].*

Паводле апытанняў, праведзеных Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў 1993 г., толькі 40% фермераў былі задаволены выдзеленымі ім надзеламі [24, с. 50]. Сярод складанасцяў развіцця сваіх гаспадарак прыватныя ўласнікі адзначалі перашкоды з боку калгасаў і саўгасаў, нястачу свабодных зямель, нежаданне мясцовых саветаў хутка вырашаць пытанне выдзялення зямель. У прыватных сялянскіх гаспадарках назіралася слабая матэрыяльна-тэхнічная база. Толькі 40% фермераў у 1993 г. былі забяспечаны тэхнікай. Высокая інфляцыя рабіла бессэнсоўным нават ільготнае крэдытаванне, улічваючы, што цана трактара «Беларусь» у канцы 1994 г. была прыблізна эквівалентна кошту 100 т малака [24, с. 56]. Таму па-ранейшаму пануючай заставалася калгасна-саўгасная сістэма. Па стане на 1 студзеня 1994 г. у Беларусі было 1 862 калгасы і 659 саўгасаў, якія апрацоўвалі большую частку сельскагаспадарчага зямельнага фонду рэспублікі [26, арк. 28]. Агучваючы праграму пераходу Беларусі да рынку, старшыня Урада адзначаў, што «бліжэйшыя гады карміць краіну будуць калгасы і саўгасы. Гэта павінна быць ясна кожнаму» [22, арк. 90].

**Заключэнне**

Такім чынам, у першыя гады незалежнасці ў сферы прыватнага сектара адбываюцца супярэчлівыя працэсы. З аднаго боку, працягвалася пашырэнне прыватнаўласніцкіх адносін, якія маглі забяспечыць эфектыўную дзейнасць эканомікі. Прыватны сектар станавіўся больш уплывовым, ён ўзбуйняўся за кошт пашырэння малога прадпрымальніцтва, працэсаў прыватызацыі, назапашвання бізнесам першапачатковага капіталу. Прадпрымальніцтва працягнула сваё развіццё на вёсцы. Пасля набыцця незалежнасці ў Беларусь пачалі прыходзіць патрэбныя краіне замежныя інвестыцыі.

З другога боку, у гэты перыяд тэмпы памяншэння ролі дзяржавы ў беларускай эканоміцы выразна запавольваюцца. Па-ранейшаму прыватны сектар займаў невялікую долю, для яго пашырэння існавала шмат абмежаванняў. Вельмі марудна рухаўся працэс прыватызацыі, якая закранала толькі невялікую частку дзяржаўнай уласнасці, у асноўным малыя і сярэднія прадпрыемствы. На вёсцы, як і раней, пануючай заставалася не заўсёды эфектыўная калгасна-саўгасная сістэма. У большасці фарміраванне прыватнаўласніцкіх адносін ішло стыхійна і не заўсёды эфектыўна. У гэты перыяд Беларусь выразна пачала адставаць па тэмпах рэфармавання ўласнай эканомікі і фарміравання недзяржаўнага сектара ад іншых рэспублік еўрапейскай часткі былога СССР.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Воп. 12. Спр. 83.
2. Морова, А. Что такое не везет / А. Морова // Белорус. рынок. – 1993. – № 3. – С. 2.
3. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 12. Спр. 626.
4. Говорят народные депутаты Республики Беларусь [интервью с депутатом Верховного Совета Республики Беларусь Л. Козиком] // Деловой вест. – 1992. – № 1. – С. 5.
5. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 1. Спр. 3049.
6. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 1. Спр. 3051.
7. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 12. Спр. 1156.
8. Исаенок, Д. Эволюция белорусской модели приватизации: предпосылки, концепции, результаты / Д. Исаенок, Т. Чижова. – Минск, 2015. – 46 с.
9. Злотников, Л. Проблемы экономических реформ в Беларуси / Л. Злотников, Н. Злотникова ; ред. и авт. предисл. П. Козаржевский. – Варшава : Центр социал.-экон. исследований, 1996. – 43 с.
10. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 1. Спр. 4141.
11. НАРБ. – Ф.7. Воп.12. Спр.1157.
12. Transition report, 1995: investment and enterprise development: economic transition in Eastern Europe and the former Soviet Union. – London : EBRD, 1995. – 223 p.
13. Народное хозяйство Республики Беларусь, 1994 год : стат. ежегодник / М-во статистики и анализа Респ. Беларусь. – Минск, 1995. – 543 с.
14. НАРБ. – Ф.7. Воп. 12. Спр. 1162.
15. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 12. Спр. 77. Арк. 30.
16. Жук, В. «Малые предприятия на МАЗ – подпорка для автогиганта?» [интервью с заместителем директора завода МАЗ Э. В. Подоляком] / В. Жук // Деловой вест. – 1992. – № 9–10. – С. 14–16.
17. Transition report, 1999: ten years of transition: economic transition in central and eastern Europe, the Baltic states and the CIS. – London : EBRD, 2000. – 299 p.
18. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 1. Спр. 2825.
19. Мясникович, М. В. Становление рыночной экономики в Республике Беларусь / М. В. Мясникович. – Минск : Мисанта, 1995. – 112 с.
20. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 12. Спр. 603.
21. «Не хочу!» [социологическое исследование службы «Грамадская думка»] // Белорус. рынок. – 1992. – № 6. – С. 2.
22. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 1. Спр. 2822.
23. Морова, А. Земля ждет хозяина / А. Морова, А. Подгайский // Белорус. рынок. – 1993. – № 1. – С. 5.
24. Сакович, В. С. Фермерство Беларуси: становление и развитие / В. С. Сакович / АН Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Изд. В. С. Сакович, 1995. – 132 с.
25. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 1. Спр. 3057.
26. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 12. Спр. 110.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 11.10.2016

***Zhylinski P.A.*** **Development of Private Sector in Economy within 1991–1994**

*The article covers one of the unexplored aspects of the sovereign Republic of Belarus history. On the basis of diverse sources the Belarusian economy private sector development in the first half of the 1990s is highlighted. The author focuses on the peculiarities of privatization, as well as the processes of development of the Belarusian entrepreneurship, its main characteristics, shines a spotlight on the main directions of the policy, aimed at attracting foreign investments. The article also reflects the main directions of the private sector development in rural areas at the initial stage of transition toward a market economy.*